# РАЗДЗЕЛ VII

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ. СУЧАСНЫ ЛІТАРАТУРНЫ ПРАЦЭС. ТЭОРЫЯ ЛІТАРАТУРЫ

## УЛАДЗІМІР СПАСОВІЧ ПРА УЛАДЗІСЛАВА СЫРАКОМЛЮ

**М. П. Варабей**

*Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, вул. Сурганава, 1, корп. 2, 220072, г. Мінск, Беларусь, 3-Zna@mail.ru*

На аснове вывучанага нарыса «Уладзіслаў Сыракомля» Уладзіміра Спасовіча зроблены высновы аб ацэнках творчай спадчыны пісьменніка. У працы прадэманстравана інтэграванасць У. Спасовіча ў кніжнасць яго малой радзімы, як раскрываецца погляд літаратурнага крытыка на постаць Уладзіслава Сыракомлі ў кантэксце гісторыі еўрапейскай літаратуры і паводле папярэдніх даследаванняў. Выяўлены асноўныя падыходы крытыка да асобы творцы: самавызначэнне паэта, палажэнне ў адносінах да чытача, грамадская пазіцыя, моцныя і слабыя бакі ў літаратуры.

***Ключавыя словы:*** беларуская літаратура XIX ст.; шматмоўная беларуская літаратура; літаратурная крытыка; рамантызм.

Ураджэнец Рэчыцы, Уладзімір Спасовіч, шырока вядомы як юрыст, праславіўся і сваімі працамі па гісторыі літаратуры і крытыкай. Значнасць унёску У. Спасовіча ў даследаванне гісторыі літаратуры і літаратурную крытыку пацвярджаецца супрацай са шматлікімі перыядычнымі выданнямі («Вестник Европы», «Atheneaum», «Kraj» і інш.), удзелам у стварэнні прац па гісторыі славянскіх літаратур поруч з акадэмікам А. Пыпіным, самастойных кніжных выданняў, асабліва месца займаюць юрыдычныя распрацоўкі ў сферы аўтарскага права (напрыклад, «О праве литературной собственности», 1861 г.).

Варта звярнуць увагу, што Уладзімір Спасовіч, часта вызначаны ў даведачнай літаратуры як «русский юрист-правовед», быў шырока інтэграваны ў культурную прастору краю, дзе нарадзіўся. Адно з апублікаваных выступленняў дае магчымасць трактаваць самаідэнтыфікацыю У. Спасовіча: «Я акунаўся ў дзяцінстве ў іншае асяроддзе, нібы ў глыбокае возера, у водах якога я паздаравеў і адужэў. Гэта возера мая радзіма, мая Літва, ці Белая, ці Чорная Русь – розныя па-рознаму яе называлі. Гэтая радзіма дадзена мне была ў гатовай форме, культурнай, гістарычнай,

у форме польскай культуры» [2, с. 271] (Тут і далей пераклад цытат наш – М. В.). У гэтым кантэксце слушнымі бачацца развагі А. Грахоцкага: «Ахарактарызаваўшы сваю радзіму метафарай “глыбокае возера”, вучоны звярнуў увагу на ўнікальнасць поліэтнічнага і поліканфесійнага рэгіёну, дзе ён нарадзіўся і вырас. Гэтае выказванне паказвае нам амбівалентнасць уяўленняў аўтара аб сваёй радзіме: з аднаго боку, называючы беларускія землі Літвой, У. Спасовіч адсылаў чытача да шматвяковых традыцый дзяржаўнасці Вялікага княства Літоўскага (ужыванне назвы Літва ў дачыненні да беларускіх губерняў заставалася распаўсюджаным да пачатку XX ст. ), з другога боку, ён падкрэсліваў, што гэта рэгіён, дзе дамінуе польская культура» [1, с. 24–25]. Таму і адзначаем надзвычайнае прыцягненне У. Спасовіча да культуры і літаратуры тагачаснай Літвы-Беларусі.

Кола зацікаўленняў складала як руская літаратура (А. Пушкін, М. Лермантаў, І. Тургенеў і інш.), так і еўрапейская (Дж. Байран, Ф. Шылер, І. Гётэ і інш.), але асаблівае месца заняла краёвая – набытак пісьменнікаў і грамадскіх дзеячаў паходжаннем з тагачаснай Беларусі, у прыватнасці, І. Лялевеля, Ю. Нямцэвіча, А. Міцкевіча, В. Поля, У. Сыракомлі.

Уладзіславу Сыракомлю (1823–1862 гг., сапр. Людвік Кандратовіч) У. Спасовіч прысвяціў асобны аднайменны нарыс, які раскрыў погляд на жыццёвы шлях, творчасць паэта і адэпта захавання гісторыка-культурнай спадчыны. Час стварэння працы датаваны канцом 1875 г. і студзенем 1876 гг., яна вытрымала некалькі перавыданняў на польскай і рускай мовах.

Аўтар нарыса «Уладзіслаў Сыракомля» падыходзіць да спадчыны «лірніка вясковага» з мноства пазіцый, зважаючы на самавызначэнне паэта на прыкладзе яго выслоўяў у творах, ідэнтыфікуе яго становішча ў адносінах да чытача, грамадскую пазіцыю. Факталагічнае апірышча У. Спасовіч бярэ ў тым ліку ў матэрыялах Ю. Крашэўскага і А. Тышыньскага. Задача нарыса сфармулявана У. Спасовічам у выглядзе пытання: «чым абавязаны быў Кандратовіч сваім папярэднікам, свайму веку, і як ён уздзейнічаў на сваё грамадства, які ўплыў захаваў дагэтуль і ў будучыні для нашчадкаў» [3, с. 12].

Уладзімір Спасовіч ідэнтыфікуе ў гісторыка-літаратурным і нацыянальным кантэксце Уладзіслава Сыракомлю як «польскага паэта літоўскай школы» (нават апошнім яе прадстаўніком, называе адным з найбольш «здольных і самастойных» паслядоўнікаў Адама Міцкевіча [3, с. 2].

Абазнаны ў перыпетыях XIX ст., У. Спасовіч праводзіць наступнае назіранне: «Кожнае грамадства тым больш схільнае бывае любавацца ідэаламі, чым менеі мае мажлівасці дзейнічаць, займацца рэальнай грамадскай справай» [3, с. 5]. Гэтае выказванне ўгрунтаванна на досведзе папярэдніх падзей, якія не завяршыліся поспехам у руху да свабоды альбо

першапачатковыя мэты не былі дасягнуты ў поўнай меры, пра гэта сведчыць гісторыя моладзевых таварыстваў, падзеі паўстанняў 1830–1831 гг. і 1863–1864 гг.

Кранальна і эмацыйна У. Спасовіч піша аб недаацэненасці Сыракомлі як творцы, балючыя непарадныя развагі аб тым, як існаваў паэт амаль ўсё жыццё, абцяжараны ўтрыманнем сям'і, пазыкамі і хваробамі – пра неабходнасць няспынна пісаць, залежнасць цягам усяго жыцця ад яўрэяў за кватэру за атрыманыя задаткі, пра патрэбу ў дровах (бо Кандратовіч часта пісаў пры сальнай свечцы), пра тое, як імкліва да нястач і нагодаў далучыліся і фізічныя пакуты: артрыт пазбавіў яго руху ног, пазней з'явілася расшырэнне касы і пячонкі, харканне крывёй, а потым і сухоты. Уладзімір Спасовіч прасочвае паводле творчасці Уладзіслава Сыракомлі прадчуванне блізкай смерці, спасылаючыся на верш «Смерць салоўкі» (1859 г.). Аўтар нарыса піша пра пышнае пахаванне «лірніка вясковага», пра позняе прызнанне яго і адсутнасць дапамогі пры жыцці. У. Спасовіч абапіраецца на тое, што Сыракомля вёў не дужа бязгрэшнае жыццё, але не верыць, што за падобныя правіны грамадства можа адвярнуцца ад чалавека. Аднак, справа не ў маральнасці, як робіць выснову крытык – «гэты самы Кандратовіч толькі і думаў, каб не сагнуць шыі і не выпусціць сваёй песні. Адсюль і сталася, што людзі, якія стаялі на вышэйшай грамадскай ступені па паходжанні і багацці, тыя людзі, пра якіх ён наўпрост казаў, што піша не для іх, яны і не ўзялі на сябе пачынання ва ўладкаванні нацыянальнай падпіскі на карысць паэта, які бядне́ў, адзінай формы ахвяравання, якую Кандратовіч мог прыняць без пачуцця прыніжэння» [3, с. 11]. Затое, калі Сыракомлі не стала «пасыпаліся на магілу кветкі, раскрыліся кішэні, узнік і літаратурны надмагільны помнік» [3, с. 11] – маецца на ўвазе 10-томнае выданне 1872 г. (роўнага якому па паўнаце няма дасюль).

У. Спасовіч параўноўвае творчасць Уладзіслава Сыракомлі і Тараса Шаўчэнкі, вызначаючы агульнае і адметнае, акцэнтуючы ўвагу на розніцы паходжання, але роўным імкненні «зрабіцца любімцам людзей непераборлівых і простых» [3, с. 4], а таксама роўнай «няздольнасці да асвятлення тэм гістарычных» [3, с. 5].

Другі раздзел працы раскрывае юнацтва Л. Кандратовіча, адукацыю, фарміраванне творчага бэк-граўнду паэта, які ён пранясе праз усё жыццё.

У. Спасовіч звяртаецца да асобных твораў розных перыядаў, разважае пра раўнавагу ва Уладзіслава Сыракомлі розуму і сэрца, таксама праводзіць паралелі ў творчасці з рускім паэтам рэвалюцыйнага рамантызму Кандрацы Рылеевым (дарэчна адзначыць, што паэма «Вайнароўскі» Рылеева існуе на польскай мове дзякуючы Сыракомлю).

Уладзімір Спасовіч зазначае, што ў творчасці Уладзіслава Сыракомлі прысутнічае рэлігійнасць, аднак у яе сутнасці няма містыцызму (у высокай ступені характэрнага рамантызму). Адна з важных заўваг у дачыненні да Кандратовіча: «На ім няма ні сляда таго польскага месіянізму, які прадстаўляў напрамак пераважна пануючы, менавіта ў тыя часы, калі Кандратовіч вучыўся і развіваўся. Месіянізм, які спутаў крылы больш магутных талентаў, не аказаў ніякага ўплыву на Кандратовіча, які не ставіў сабе ніколі іншых задач, апрача чыста мастацкіх» [3, с. 5]. Такое выказванне, відавочна, супярэчыць не толькі ідэйнаму зместу прац Уладзіслава Сыракомлі, але выказванням самога У. Спасовіча – «польскага месіянізму» ў іх і сапраўды не назіраецца (ды і да польскай літаратуры Л. Кандратовіча адносілі толькі на аснове мовы твораў), аднак большасць твораў «лірніка вясковага» маюць глыбокі патрыятычны пафас.

У II раздзеле працягваюцца і развагі аб творах Л. Кандратовіча на гістарычную тэматыку і чаму яны, паводле меркавання У. Спасовіча, не мелі поспеху: «Ён марыў аб лаўрах гістарычнага паэта Літвы і Польшчы, у творах сваіх, што адносіліся да гэтага роду, ён бачыў галоўныя свае заслугі. Толькі пазнейшы час паказаў памылку, як самога паэта, так і яго сучаснікаў» [3, с. 27]. Даследчык называе прыхільнасць да тэмы мінуўшчыны «памылкай ў пакліканні» [3, с. 27].

Цягам некалькіх раздзелаў У. Спасовіч падрабязна разглядае слабасці гістарычнага эпасу (хутчэй, ліра-эпасу) і падарожных нарысаў і нататак Уладзіслава Сыракомлі, падкрэсліваючы хібы адзначаных твораў. Неаднаразова крытык цісне на адсутнасць сістэмнай адукацыі ў Кандратовіча, напрыклад, зазначае, што для складання эпасу «апрача прыроджанага таленту, неабходныя яшчэ і веды, а іх-то Сыракомля і не меў, таму што быў самавукам, адукаваў сябе сам, спосабам арыгінальным і дзіўным, як зараз ніхто не вучыцца» [3, с. 34–35]. Тым не менш, У. Спасовіч ухваляе апірышча паэта-Сыракомлі на асабісты досвед, начытанасць у гісторыі, у тым ліку, гісторыі літаратуры, перакладах. Нягледзячы на гэта, крытык усё ж адзначае адсутнасць маштабнасці мыслення паэта, банальнасць сюжэтаў, адсутнасць шырокага бачання агульнай карціны ў творах, угрунтаваных на падзеях даўніны – адкрыта няўдалымі будуць названы, напрыклад, паэмы «Дачка Пястаў», «Маргер», вершаваныя драмы «Магнаты і сірата» і «Каспар Карлінскі», проза, кшталту «Вандровак па маіх былых ваколіцах» і інш. Кампілятыўнай прызнае У. Спасовіч і «Гісторыю літаратуры ў Польшчы ад старажытнасці да нашых часоў» (1850 г., 1852 г.), хаця яна карысталася попытам і была перакладзена на рускую мову (1860 г., 1862 г.).

У. Спасовіч бачыць агулам грамадска-палітычную сітуацыю XIX ст., асабліва вызначаючы важнасць падзей 1863–1864 гг., падкрэсліваючы,

што нават калі б «памылковая і пагібельная справа 1863 года» [2, с. 6], то паварот да зменаў усё роўна адбыўся б (маецца на ўвазе вызваленне сялянства ад прыгону). І ў гэтым дачыненні У. Спасовіч заўважае ва Уладзіславе Сыракомлі «шчырага і дзейнага наватара», на якім «паэзія папярэдняй школы завяршала сваю эвалюцыю і вярталася назад да сваёй першакрыніцы – да народа» [3, с. 6]. Такое меркаванне цалкам абгрунтавана на аснове твораў паэта, у дачыненні да якіх У. Спасовіч выказаўся надзвычай камплементарна, – гэта «gawędy ludowe» або народныя гутаркі (гавэнды) у сучасным вызначэнні – творы, прысвечаныя «люду паспалітаму»: селяніну, працаўніку-найміту, салдату, дробнаму шляхціцу – для якіх шчыраваў паэт. У гэтым ключы будуць ухвалены за сваю злабадзённасць драмы канца 1850-х гг. «Хатка ў лесе» і «Вясковыя палітыкі».

Уладзімір Спасовіч заўважае, што нават адсутнасць ці знікненне гістарычных твораў Сыракомлі ніяк бы не паўплывала на ўспрыняцце паэта. Аднак нельга не ўлічваць моцны бок, які адзначыў крытык: «Трэба заўважыць, што асабіста Кандратовічу складана было знайсці пераймальнікаў; прывабнасць яго паэзіі заключаецца не ў вышыні палёту, не у багацці і разнастайнасці сюжэтаў, нават не ў манеры і метадзе песні, але ў той асабістай адметнасці, якую мы назіраем у гартані салаўя і якую мы знойдзем у самаадданым захапленні паэта, – у тым, што яго асабістая натура рабіла з яго быццам бы самы дасканалы музычны інстумент, які адгукаўся стройна і гучнана кожны дотык, прытым міжволі, такім чынам, што ён гучаў да той самай хвіліны, калі парваліся струны» [3, с. 6–7]

Сярод заняпаду шляхецтва Уладзімір Спасовіч бачыў літаратурную творчасць паратункам для Уладзіслава Сыракомлі, «шляхам найменшага супраціву», а настальгічны зварот аўтара да гісторыі вызначыў так: «Справа ў тым, што прыхільнасць да мінулага, улюбёнасць у гэта мінулае з'яўлялася у Кандратовіча толькі часцінкай таго моцнага і гарачага пачуцця, якое ахоплівала яго са ўсіх бакоў, гаспадарыла ў душы яго непадзельна, прасочвалася ў яго да мозгу касцей. Гэтым бязмежным пачуццём была ў яго любоў да роднага краю, як неабходнай яму стыхіі, па-за якой яму здавалася немагчымым дыхаць і існаваць» [3, с. 33].

Апазіцыя любові-спачування і паблажлівасці да Кандратовіча суправаджае ўвесь нарыс. Прызнанне найчуллівейшага, інтуітыўнага творцы ў Сыракомлі, самародка-паэта, супрацьпастаўляецца крытыцы неадукаванасці і дэзарыентаванасці ў пісьменніцкай працы. Аднак, у абарону Уладзіслава Сыракомлі павінны зрабіць наступную заўвагу: не раз адзначае У. Спасовіч любоў да простага люду – усеабдымную любоў, якая займала усё сэрца паэта. Крытык нават ужывае тэрмін «хлапаманства», верагодна, моцна ўтрыраваны. А сам Л. Кандратовіч зазначае, што піша для захавання памяці пра даўнія часы і для асветы – у тым ліку, для шырокіх

людскіх мас, выступае за роўныя магчымасці па-за залежнасцю ад паходжання і ўзроўню дабрабыту. На аснове нарыса можна меркаваць аб стаўленні У. Спасовіча да творчай спадчыны Л. Кандратовіча, з улікам біяграфіі «лірніка вясковага» – чыннікаў, якія фарміравалі творцу – выхавання і развіцця, літаратурных уплываў, грамадска-палітычных абставінаў да т.п. Адмысловае месца ў працы займае крытыка твораў Уладзіслава Сыракомлі на гістарычную тэматыку, якія залічваюцца У. Спасовічам да найгоршых у практыцы з прычыны несістэмнай, на думку крытыка, адукаванасці паэта, у процівагу гэтаму ў працы ўхвалены народныя гутаркі паэта.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Грахоцкий А. П.* В. Д. Спасович о проблеме национальной самоидентификации // В служении Фемиде и обществу: страницы жизни и деятельности В. Д. Спасовича : сборник статей / Гомель : ГГУ им. Ф. Скорины, 2016. С. 21–30.

2. *Спасович В. Д.* Моя юбилейная речь на товарищеском обеде 31 мая 1891 г. // Собрание сочинений В. Д. Спасовича : в 10 т. СПб, 1890. Т. 9. С. 269–276.

3. *Спасович В. Д.* Собрание сочинений В. Д. Спасовича : в 10 т. СПб, 1913. Т. 1 : Литературные очерки и портреты.